УДК 378.035.6

В. А. Кузьміч, заг. кафедры беларускай мовы

# КОМПЛЕКСНАЕ ВЫКАРЫСТАННЕ РАЗНАСТАЙНЫХ ФОРМ ВЫХАВАЎЧАЙ ПРАЦЫ НА КАФЕДРЫ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

The main ways in which the Belarusian language department organizes the whole educational process are exposed in the article. The stress is made on the complex use of different educational work forms. The experience of the Belarusian language department is analyzed in context of 60$^{th}$ anniversary of the victory in the Great Patriotic war.

Выхаваўчая праца дзейсная тады, калі ёй нададзены характар цэласнай сістэмы. У нашым разуменні сістэма вызначаецца як сукупнасць і адзінства ўсіх звёнаў працэсу выхавання і яго рэалізацыя ва ўмовах таго ці іншага калектыву. Безумоўна, выхаваўчая сістэма прадугледжвае комплекснае выкарыстанне разнастайных форм працы, г. зн. любое выхаваўчае мерапрыемства ўключае ў пэўнай ступені патрыятычныя, маральныя і эстэтычныя элементы і адпаведныя формы іх увасаблення. Нягледзячы на тое, што існуе тэарэтычны падзел мерапрыемстваў на ідэалагічныя, ідэйна-патрыятычныя, нацыянальныя і інтэрнацыянальныя напрамкі, на практыцы ўсё звязана і падпарадкавана адной мэце – дасягненню сацыяльнага ідэалу чалавека XXI ст., чалавека-грамадзяніна сваёй краіны, які не толькі захоўвае і паважае культурныя традыцыі свайго народа, але і ўсведамляе мэты і задачы, пастаўленыя беларускім грамадствам і дзяржавай. Такі чалавек імкнецца да прафесіяналізму, асновай якога з'яўляецца высокая маральнасць, грамадзянскасць, патрыятызм, павага да працы. Канешне, гэта і накіраванасць на здаровы лад жыцця, арыентацыя на годнае выкананне сваіх сацыяльных роляў. Таму комплекснае выкарыстанне розных форм выхавання скіравана на тое, каб дзяржаўныя падыходы былі ўвасоблены ў канкрэтнае дзеянне. Уся выхаваўчая праца павінна быць падпарадкавана адзіным дзяржаўным мэтам і задачам.

Комплекснае выкарыстанне разнастайных форм выхавання магчыма найперш пры ўмове добрага ведання тых нарматыўных дакументаў, якія вызначаюць мэты і задачы выхаваўчага працэсу. Выбар метадаў выхаваўчай працы ў ВНУ вызначаецца інтарэсамі дзяржавы і грамадства, а таксама патрэбамі студэнцкай моладзі. Таму пры планаванні выхаваўчай працы неабходна абапірацца найперш на веданне Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, законаў нашай краіны. Важным арыенцірам ва ўдасканаленні выхаваўчай працы з'яўляюцца Канцэпцыі і Праграма выхавання навучэнскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь. Менавіта гэтыя дакументы вызначаюць стратэгію і тактыку выхавання, надаюць выхаваўчай працы сістэмны характар, упарадкаваны з улікам патрабаванняў часу і рэфармавання сістэмы адукацыі. Варта звярнуць увагу і на Канцэптуальныя асновы ідэйна-выхаваўчай працы з моладдзю, скіраваныя на разуменне палітыкі і ідэалогіі нашай дзяржавы ў адносінах да іншых краін і народаў, да ўласных грамадзян, іх культурнай і навуковай спадчыны, да гістарычных дасягненняў беларускага народа. Для комплекснага выкарыстання выхаваўчых сродкаў распрацаваны Крытэрыі і паказчыкі эфектыўнасці ідэалагічнага суправаджэння выхаваўчай працы з навучэнцамі і студэнтамі ва ўстановах адукацыі. Накіраванасць педагогаў на ўменне дзейнічаць зладжана на ўсіх ступенях бесперапыннай адукацыі, выкарыстанне магчымасцяў навучальных устаноў, сям'і, сродкаў масавай інфармацыі, літаратуры, мастацтва, маладзёжных аб'яднанняў – далёка не поўны пералік прапанаваных інструментаў выхавання.

Інструктыўна-метадычныя пісьмы Міністэрства адукацыі ад 17 жніўня 2004 г. дакладна вызначаюць прыярытэтныя задачы і асноўныя напрамкі выхаваўчай працы на 2004–2005 гг. Асаблівая ўвага выкладчыкаў, куратараў студэнцкіх груп была засяроджана на комплексным выкарыстанні разнастайных форм выхаваўчай працы пры падрыхтоўцы да 60-годдзя Перамогі, а таксама на правядзенні VIII Рэспубліканскай выстаўкі навукова-метадычнай літаратуры «Ідэалагічнае суправаджэнне і маніторынг выхаваўчага працэсу ва ўстановах адукацыі». Менавіта гэта выстаўка падсумоўвае цэласнасць, сістэмнасць і выніковасць працы ўсіх удзельнікаў выхаваўчага працэсу.

З улікам вышэйзгаданых дзяржаўных дакументаў кафедрай беларускай мовы распрацоўваецца разгорнутая праграма выхаваўчай працы, якая і арыентуецца на разнастайныя формы яе рэалізацыі. Акрамя такіх традыцыйных форм выхавання, як тэматычныя гутаркі, лекцыі-гутаркі, бінарныя лекцыі з запрашэннем навукоўцаў, дыскусіі, віктарыны, праводзяцца і больш значныя мерапрыемствы агульнауніверсітэцкага характару. Гэта культурна-асветніцкія канферэнцыі, круглыя сталы, экскурсіі-падарожжы па родным краі, музейныя заняткі, выстаўкі да знамянальных дат, фестывалі, культпаходы, прафесійна-арыентаваныя сустрэчы. Толькі за 2004–2005 гг. праведзена 104 гадзіны музейных

заняткаў, 8 канферэнцый, 5 экскурсій, 10 прафесійна-арыентаваных сустрэч, падрыхтавана 4 выстаўкі творчых прац студэнтаў да Рэспубліканскага Дня маці, 60-годдзя Перамогі і інш. Фестываль «Зямлі адзінай людзі» аб'яднаў прадстаўнікоў розных нацыянальных супольнасцяў Беларусі, стаўшы агульнауніверсітэцкім святам.

Да такой знамянальнай падзеі, як 60-годдзе Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне, быў распрацаваны цэлы шэраг мерапрыемстваў, якія ўключалі ў сябе і тэматычныя гутаркі, і творчыя даследаванні, летапісы-радаводы. Гэта і шэраг сустрэч з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, наладжванне валанцёрскага руху (наведванне ветэранаў вайны і працы дома), выступленні студэнтаў з прэзентацыямі творчых даследаванняў у школах, гімназіях, студэнцкіх групах. Распрацаваны такія турыстычныя маршруты, як «Помнікі і памятныя месцы Мінскага патрыятычнага падполля», «Акупацыйны рэжым. Месцы масавага знішчэння савецкіх ваеннапалонных, мірнага грамадзянскага насельніцтва, партызанаў і падпольшчыкаў», «Помнікі, брацкія магілы савецкіх воінаў, якія загінулі пры вызваленні Мінска», ваенна-гістарычны маршрут «Мемарыяльныя дошкі, помнікі славутым военачальнікам, воінам і партызанам». Плануецца падарожжа па маршрутах «Мінск – Хатынь – Курган Славы», «Мінск – Трасцянец», «Мінск – Ушачы – мемарыяльны комплекс «Прарыў», Музей партызанскай славы».

Нікога не пакінула абыякавым сустрэча са старшынёй Саюза блакаднікаў Ленінграда ў Беларусі М. Д. Ягадніцынай. Паказаны відэафільм аб тых страшных падзеях, той блакадны кавалачак хлеба цаной у цэлае жыццё, балючы расказ блакадніцы – усё гэта глыбока ўразіла і кранула студэнтаў.

Да 60-годдзя Перамогі студэнтамі розных факультэтаў і спецыяльнасцяў пад кіраўніцтвам кафедры беларускай мовы падрыхтаваны 33 творчыя працы (даследаванні, радаводы, летапісы), якія накіраваны на рэспубліканскія конкурсы, што праводзяцца па ініцыятыве Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, БРСМ, Рэспубліканскага фонду «Узаемаразуменне і прымірэнне».

Спрыяюць комплекснаму выкарыстанню разнастайных форм выхавання гурткі «Памяць», «Пазнай свой край», «Спадчына», «Крыніца», «Міласэрнасць», а таксама літаратурны клуб «Ветліца».

Падсумаваннем выхаваўчай працы кафедры стаў удзел у VIII Рэспубліканскай выстаўцы навукова-метадычнай літаратуры «Ідэалагічнае суправаджэнне і маніторынг выхаваўчага працэсу ва ўстановах адукацыі». За падрыхтаваныя і прадстаўленыя кафедрай матэрыялы БДТУ быў узнагароджаны Дыпломам I ступені за патрыятычнае выхаванне студэнтаў з выкарыстаннем матэрыялаў аб ратным і працоўным подзвігу беларусаў, прысвечаных 60-годдзю Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, а таксама Дыпломам I ступені за сістэмны падыход да распрацоўкі ідэалагічнага суправаджэння выхаваўчага працэсу.

Такім чынам, комплекснае выкарыстанне ўсіх форм выхавання, прафесіяналізм і кампетэнтнасць удзельнікаў выхаваўчага працэсу паспрыялі фарміраванню ў студэнцкай моладзі пачуцця любві і павагі да сваёй Радзімы, гонару за яе дасягненні, гатоўнасці годна і сумленна выконваць абавязкі грамадзяніна Рэспублікі Беларусь.